# КУРСЫ «МОВА НАНОВА ВІЦЕБСК»: НОВЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Дубоўская Т. А.**
Рэспубліка Беларусь, г. Віцебск
Віцебскі філіял Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО»,
дацэнт кафедры замежных моў і міжкультурных камунікацый,
кандыдат філалагічных навук

Курсы беларускай мовы «Мова нанова» – адукацыйны праект, які дзейнічае сення ў сямнаццаці гарадах Беларусі: Бабруйску, Баранавічах, Барысаве, Брэсце, Браславе, Віцебску, Гродне, Глыбокім, Гомелі, Лідзе, Магілеве, Маладзечне, Мінску, Рэчыцы, Салігорску, Светлагорску, Шаркаўшчыне. Акрамя гэтага, курсы займелі папулярнасць у Варшаве, Кіеве, Стакгольме, Лімерыку.

Упершыню бясплатныя курсы беларускай мовы пачалі сваю дзейнасць у Мінску 13 студзеня 2014 года. Ініцыятарамі стварэння выступілі філолаг Алеся Літвіноўская і журналіст Глеб Лабадзенка. У лістападзе таго ж года адукацыйны праект атрымаў дзяржаўную рэгістрацыю як «Сацыяльна-культурная ўстанова развіцця беларускай мовы і культуры «Мова нанова». У чэрвені 2014 года – Гран-пры V Фестывалю беларускамоўнай рэкламы і камунікацыі aDNaK! у намінацыі «Грамадсказначныя праекты» [1], а ў снежні стаў пераможцам конкурсу «Падзея года» на V Фестывалі нефармальнай адукацыі [2].

Канцэпцыя курсаў – неакадэмічнае вывучэнне роднай мовы: лексіка і граматыка засвойваюцца слухачамі ў разнастайных інтэрактыўных формах. На кожныя заняткі, прысвечаныя канкрэтнай тэме, у якасці экспертаў запрашаюцца дасведчаныя беларускамоўныя госці.

У Віцебску адкрыцце першага сезона курсаў «Мова нанова» адбылося 25 траўня 2014 года. У 2019 годзе віцебскія курсы адзначылі свае пяцігоддзе [3]. Юбілейны сезон меў істотнае адрозненне ад папярэдніх сезонаў: асаблівая ўвага вядоўцамі адукацыйнага праекта была скіравана на таленавітых, ініцыятыўных гараджан – віцяблян, якія дасягнулі значных поспехаў у сваей прафесійнай дзейнасці, папулярызуюць беларускую мову ў паўсядзенным жыцці, імкнуцца да ўдасканалення адукацыйнай, культурнай, экалагічнай і іншых інфраструктур горада.

Сярод прыярытэтных накірункаў курсаў «Мова нанова Віцебск» можна вылучыць наступныя:

1. Пашырэнне і ўдасканаленне ведаў па беларускай мове. Гэта – неакадэмічнае вывучэнне лексічнага складу роднай мовы, яе акцэнталагічных, арфаграфічных, марфалагічных, словаўтваральных, сінтаксічных і стылістычных нормаў, навучанне прыгожаму, правільнаму вымаўленню, культуры маўлення.

2. Знаемства з вуснай народнай творчасцю беларусаў: старажытнымі святамі (Каляды, Саракі, Камаедзіца, Масленіца, Дзяды, Купалле і інш.); аўтэнтычнымі рэгіянальнымі абрадамі і рытуаламі («Пахаванне Дзеда», «Пахаванне Бабы», «Цягнуць калодку», «Трэсці падушкі», «Жаніцьба Цярэшкі», «Жаніцьба коміна» і інш.); самабытнымі традыцыямі, звычаямі, гульнямі («Вадзіць казла», «Пячы ката», «Яшчур», «Сарваць вішаньку» і інш.). Вывучэнне тэм, прысвечаных народнай матэрыяльнай і духоўнай культуры («Сімволіка беларускай хаты», «Сімволіка левага і правага ў традыцыйнай культуры беларусаў», «Сімволіка лічбаў»).

3. Сустрэчы з айчыннымі гісторыкамі (Сяргей Тарасаў, Алег Трусаў, Павел Церашковіч, Анатоль Дулаў, Дзяніс Юрчак), фалькларыстамі (Таццяна Валодзіна, Людміла Нікіціна), краязнаўцамі (Юрый Жыгамонт, Мікалай Півавар, Міхась Дук), мовазнаўцамі (Вінцук Вячорка, Юрась Бабіч, Алена Дзядова, Генадзь Арцяменак, Ганна Мезенка), празаікамі (Уладзімір Арлоў, Зміцер Бартосік, Франц Сіўко, Сяргей Рублеўскі), паэтамі (Андрэй Хадановіч, Усевалад Сцебурака, Уладзімір Папковіч, Міхась Мірановіч, Людміла Сіманенак), мастацтвазнаўцамі (Міхась Цыбульскі, Святлана Баранкоўская, Аляксандр Лісаў), тэатраламі (Раіса Грыбовіч, Юрась Цвірка, Юрась Франкоў, Аляксандр Маханькоў, Ганна Сцепанец, Вячаслаў Грушоў, Ірына Цішкевіч), спевакамі (Іван Кірчук, Ігар Варашкевіч, Зміцер Вайцюшкевіч, Таццяна Грыневіч-Матафонава, Сяржук Доўгушаў) і інш.

4. «Адкрыцце нанова», ці знаемства гараджан з таленавітымі віцебскімі грамадскімі і культурнымі дзеячамі: экскурсаводамі (Уладзімір Ткачэнка, Аляксандр Мінін), харэографамі (Сяргей Талкач, Марына Кушнярова), журналістамі (Таццяна Матвеева, Вікторыя Дашкевіч), бізнесоўцам (Віталь Броўка), рамеснікам-рэканструктарам (Макар Бабенка), музыкам (Міхась Рубін) і інш.

5. Арганізацыя і правядзенне інтэлектуальных гульняў, літаратурных дзіцячых конкурсаў, дыскусій, кінапраглядаў, экскурсій, сумесных паходаў у Беларускі тэатр «Лялька»,

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, выступленне вядоўцаў курсаў у віцебскіх дзяржаўных установах адукацыі.

6. Удзел у творчых імпрэзах (літаратурна-музычны фэст «Барадулінкі», прэзентацыя літаратурнага альманаха Віцебскага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў «Ратуша»), акцыях (наведванне Віцебскага прытулка для бяздомных жывел, напісанне гарадской дыктоўкі, прымеркаванай да Міжнароднага дня роднай мовы), канферэнцыях (міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Віцебскі край» (г. Віцебск), міжнародная навуковая канферэнцыя «Танкаўскія чытанні» (г. Мінск)) і інш.

У красавіку 2019 года курсы «Мова нанова Віцебск» былі адзначаны дыпломам у намінацыі «Адукацыйны праект» на цырымоніі ўручэння прэміі для актывістаў «Грамадскі фуршэт», арганізаванай па ініцыятыве сацыяльна-культурніцкай установы Vitebsk4Me («Віцебск для мяне») [4].

Адметнасць шостага сезона курсаў – іх featured рознафарматнасць: штомесяц заняткі ладзяцца ў фарматах інтэлектуальнай гульні, экспертнага інтэрв'ю, майстар-класа і грамадскай ініцыятывы.

Такім чынам, курсы «Мова нанова Віцебск» сення – гэта больш чым адукацыйны праект. Вывучаючы мову, літаратуру, гісторыю, культуру сваей Радзімы, знаемячыся з таленавітымі суайчыннікамі, слухачы адкрываюць для сябе новую Беларусь, пачынаюць свядома шанаваць і ганарыцца беларушчынай.

*Спіс цытаваных крыніц*

1. Мова Нанова атрымала Гран-пры фестывалю Аднак! [Электронны рэсурс] // Мова нанова. – Рэжым доступу: http://www.movananova.by/naviny/mova-nanova-atrymala-gran-pry-festyvalyu-adnak.html. – Дата доступу: 11.10.2019.

2. Левко, А. Неформальное образование в Беларуси стало более заметным [Электронны рэсурс] / А. Левко // Часопіс «Адукатар». – Рэжым доступу: http://adukatar.net/wp-content/uploads/2016/02/Pages_final.pdf. – Дата доступу: 03.10.2019.

3. Курсы «Мова нанова Віцебск» адзначылі пяціголдзе [Электронны рэсурс] // Витебский курьер. – Рэжым доступу : https://vkurier.by/174401. – Дата доступу: 05.10.2019.

4. «Дзякуй» за актывізм [Электронны рэсурс] // Vitebsk4.me. – Рэжым доступу : http://vitebsk4.me/news/society/dzjakuj_za_aktiv_zm. – Дата доступу : 28.09.2019.